

*Бібліяграфія*

Рэцэнзія

# *Па старонках бюлетэня "Новыя кнігі"*

У 2000 г. споўнілася 40 гадоў штомесячнаму бібліяграфічнаму бюлетэню **«Новыя кнігі»**, што выдаецца навукова-бібліяграфічным аддзелам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. За гады свайго існавання дапаможнік набыў шырокую папулярнасць у бібліятэках краіны, заваяваў пэўны аўтарытэт за межамі Беларусі, стаў адным з лепшых беларускіх бібліяграфічных выданняў. Некалькі пакаленняў бібліёграфаў бібліятэкі ўнеслі вялікі ўклад у станаўленне бюлетэня, удасканаленне яго структуры і методыкі распрацоўкі матэрыялаў. З дапамогай выдання чытачы і бібліятэкары маюць магчымасць арыентавацца ў патоку новых беларускіх кніг і публікацый у перыядычным друку (раздзел **«Навінкі беларускага друку»**), знаёміцца з тэматычнымі рэкамендацыйна-бібліяграфічнымі матэрыяламі (дадаткі да бюлетэня).

Традыцыйна «Новыя кнігі» пачынаюцца з раздзела «Навінкі беларускага друку». Гэта асноўная частка бюлетэня. Тут прадстаўлена найбольш значная друкаваная прадукцыя, якая прызначана для агульнай і часткова прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і вольнага часу. Яна складаецца з падраздзелаў «Пра Беларусь і яе жыхароў», «У дапамогу прафесійнаму чытанню» (менеджэрам і прадпрымальнікам, настаўнікам і работнікам дашкольных устаноў, работнікам сельскай гаспадаркі і тым, хто працуе на персанальным камп'ютэры), «У дапамогу абітурыентам», «Цікава ведаць, карысна ведаць», «Мастацкая літаратура і творы фальклору народаў свету», «Кнігі і публікацыі — дзецям», «У полі зроку рэцэнзента».

Каб зрабіць бібліяграфічныя паведамленні «Навінак беларускага друку» найбольш зручнымі для работнікаў бібліятэк, настаўнікаў, студэнтаў і наогул шырокага кола чытачоў, складальнікі і рэдактары асаблівую ўвагу звяртаюць на ўдасканаленне інфармацыі пра новыя публікацыі. Вялікая ўвага надаецца раскрыццю зместу кніг і артыкулаў у падраздзеле «Пра Беларусь і яе жыхароў». У анатацыі выносяцца геаграфічныя назвы, прозвішчы, даты, удакладняецца тэма публікацый. Усё гэта знаходзіць адлюстраванне ў дапаможных паказальніках — геаграфічным, персанальным, прадметна-тэматычным, якія штогод змяшчаюцца ў дадатку да 12-га нумара «Новых кніг».

Значна ўзбагачаюць бюлетэнь «Новыя кнігі» дадаткі, якія выходзяць пад адной вокладкай з выданнем. Гэта— тэматычныя рэкамендацыйна-бібліяграфічныя матэрыялы, асноўная мэта якіх — папулярызацыя нацыянальнай культурнай і гістарычнай спадчыны, а таксама іншых актуальных ведаў. Іх можна выкарыстоўваць як самастойныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Разгледзім некаторыя бібліяграфічныя матэрыялы, што прапанаваліся ў якасці дадаткаў у 2000 г.

**«Бібліятэкі Беларусі — юбіляры»** — так называецца дадатак да першага нумара «Новых кніг». Ён складаецца з гістарычнай даведкі і спіса літаратуры, прысвечанай бібліятэкам, якія ў 2000 г. адзначылі свой юбілей: Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэцы імя І.С.Лупіновіча, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі, Рэспубліканскай навукова-медыцынскай бібліятэцы, Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М.Горкага, Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага, Віцебскай абласной бібліятэцы і Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С.Пушкіна. Матэрыялы да дат падрыхтавалі бібліятэкі-юбіляры.

У 2000 г. адзначылі свой юбілей і некаторыя вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі. Ім прысвечаны дадатак **«Вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі—юбіляры»** (складальнік Г.В.Брага; № 3 бюлетэня). Тут сабраны матэрыялы пра Беларускую дзяржаўную політэхнічную

акадэмію, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт, Беларускі універсітэт культуры, Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Сапраўдным падарункам настаўнікам, бібліятэкарам і ўсім прыхільнікам творчасці Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча з'яўляецца бібліяграфічны агляд «**Ён любіў Беларусь**», прымеркаваны да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, які, па сутнасці, стварыў беларускую гістарычную прозу, узняў некранутыя пласты (складальнік В.У.Ліхімовіч; № 4).

Кожны народ ганарыцца сваёй культурнай спадчынай, таленавітымі людзьмі. Сярод найбольш яркіх і значных прадстаўнікоў беларускай культуры вылучаецца асоба Францыска Скарыны. Ён увайшоў у нашу гісторыю як першадрукар і вучоны, асветнік і гуманіст, паэт і медык, батанік і астраном. Шосты нумар бюлетэня «Новыя кнігі» ў якасці дадатка прапануе бібліяграфічны спіс «**Францыск Скарына: Да 510-годдзя з дня нараджэння**» (складальнік Т.Я.Мамедава). Акрамя разгорнутай даведкі, тут прадстаўлены выданні і публікацыі 90-ых гг., згрупаваныя па раздзелах: «Са спадчыны Ф.Скарыны», «Адкрыць нашчадкам Скарыну» (з падраздзеламі «Дакументы і матэрыялы канферэнцый, прысвечаных першадрукару», «Пра жыццё і працу Ф.Скарыны», «Літаратурная і выдавецкая дзейнасць», «Асаблівасці моватворчасці», «Графічнае мастацтва», «Філасофска-этычныя, асветна-выхаваўчыя і іншыя погляды», «Скарына і нашчадкі», «Вобраз першадрукара ў сучасным мастацтве і літаратуры»).

Карысныя і цікавыя веды на старонках бюлетэня могуць атрымліваць настаўнікі, педагогі. Акрамя пастаяннай рубрыкі «Настаўнікам і работнікам дашкольных устаноў», у раздзеле «Навінкі беларускага друку» ім адрасаваны і некаторыя бібліяграфічныя матэрыялы, падрыхтаваныя супрацоўнікамі Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі Беларусі А.Дз.Кухаравай і Л.Б.Яхімовіч, змешчаныя ў дадатках да «Новых кніг». Так, № 4 за 1999 г. прапануе рэкамендацыйна-бібліяграфічны спіс «**Метадычная літаратура — настаўніку-прадметніку**». Новыя праграмы па шэрагу вучэбных прадметаў пабуджаюць настаўнікаў так арганізаваць навучанне, каб яно не толькі давала моцныя веды і навыкі, але і спрыяла актыўнаму разумоваму развіццю вучняў, росту іх творчых здольнасцей, выхаванню інтарэсу да самаадукацыі. Для поспеху такой справы настаўніку неабходна пастаянна павышаць кваліфікацыю, быць у курсе ўсяго новага ў педагогіцы і педагагічнай псіхалогіі, знаёміцца з перадавым вопытам. Аказаць дапамогу настаўнікам-практыкам у іх працы, паглыбленні і пашырэнні ведаў і прызначаны вышэйназваны бібліяграфічны спіс. Ён змяшчае метадычныя выданні для пачатковай, базавай і сярэдняй школы за 1993—1998 гг. Выкладчыкі вучэбных дысцыплін у школе знойдуць тут кнігі па новых тэхналогіях навучання, распрацоўкі ўрокаў, займальны матэрыял і іншую літаратуру ў дапамогу практычнай дзейнасці. Анатаваны спіс складаецца з дзвюх частак: «Прадметы гуманітарнага цыкла» і «Прадметы прыродазнаўча-матэматычнага цыкла».

Рэалізацыя школьнай рэформы немагчыма без укаранення ў практыку работы школ дасягненняў псіхолага-педагагічнай навукі. Таму складальнікі бюлетэня «Новыя кнігі» палічылі неабходным змясціць на старонках выдання бібліяграфічны спіс «**Псіхалагічныя веды— педагогу**» (№ 7, 2000 г.). Спіс уключае беларускія і расійскія выданні за апошнія 5 гадоў.

Штогод у адным з апошніх нумароў «Новых кніг» змяшчаецца спіс юбілейных дат на наступны год. Так, у дадатку да № 9 за 2000 г. прадстаўлены інфармацыйны спіс «**Беларускі каляндар, 2001 год**». Створаны ён на аснове базы даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая змяшчае афіцыйныя звесткі з энцыклапедычных і даведачных выданняў, падрыхтаваных у асноўным дзяржаўнымі выдавецтвамі. На жаль, запланаваны аб'ём гэтага спіса (два друкаваныя аркушы) не дазваляе змясціць поўную інфармацыю аб юбілярах і юбілейных падзеях 2001 г. У спіс увайшлі дзеячы, якія зрабілі значны ўклад у развіццё навукі, культуры і г.д., адыгралі пэўную ролю ў гісторыі і грамадскім жыцці; найважнейшыя гістарычныя падзеі; аб'екты прыроды рэспубліканскага значэння; усе навуковыя і навукова-даследчыя ўстановы, усе ВНУ, спецыяльныя сярэднія навучальныя ўстановы і некаторыя ліцэі і школы, якія маюць значныя дасягненні і даўнюю гісторыю; рэспубліканскія выдавецтвы; рэспубліканскія і абласныя тэатры;рэспубліканскія, абласныя і раённыя музеі; творчыя саюзы і інш.

Матэрыялы да юбілейных дат звычайна змяшчаюцца ў некалькіх нумарах «Новых кніг» пад назвай «Даты беларускага календара». Яны складаюцца з біяграфічнай ці гістарычнай даведкі і спіса літаратуры, прысвечанай разглядаемай асобе ці падзеі. У дадатку да № 10 за 2000 г. апублікаваны матэрыялы да юбілеяў мастакоў Ф.Рушчыца (1870—1936) і К.Альхімовіча (1840—1916), пісьменнікаў І.Шамякіна (нар. у 1921 г.) і І.Мележа (1921—1976), дзеяча міжнароднага рэвалюцыйнага руху М.Судзілоўскага(1850— 1930), полацкай князёўны, асветніцы, беларускай святой

Ефрасінні Полацкай (1101(?) — 1167 ці 1173), асветніка, кнігавыдаўца і літаратара І.Капіевіча (1651—1714), філолага-славіста і этнографа Я.Карскага (1861—1931), артыста эстрады і кампазітара У.Мулявіна (нар. у 1941 г), мовазнаўца П.Шубы (1926—2000), актрысы В.Полы (1901—1989), а таксама матэрыялы да 725-годдзя г. Камянца (упершыню ўпамінаецца ў 1276 г.) і 250-годдзя стварэння Слуцкага тэатра Радзівіла (1751—1760).

Яшчэ раз адзначым, што беларусазнаўчая тэматыка з'яўляецца прыярытэтнай для бюлетэня «Новыя кнігі». Але на старонках дадаткаў да выдання публікуюцца бібліяграфічныя матэрыялы і па іншых пытаннях. Так, у № 8 за 2000 г. прапанаваны рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс **«Не болейте, не старейте»** (складальнік І.А.Маісеева). Няма такога чалавека, які не жадаў бы быць здаровым. У апошнія гады кніжны рынак прапануе шмат папулярнай літаратуры на гэту тэму. Лепшыя выданні беларускіх выдавецтваў за апошнія два гады прадстаўлены ў дадзеным бібліяграфічным спісе. Назвы яго раздзелаў гавораць аб змесце прапануемай літаратуры: "Доктор внутри вас, или Психология здоровья", "Практика христианского целительства", "Консультирует космос...", "Народная медицина", "Дары природы", "Исцеление питанием", "Зелёная аптека", "Домашний доктор".

Такім чынам, бібліяграфічны бюлетэнь "Новыя кнігі" аказвае чытачам сур'ёзную дапамогу ў паглыбленні і пашырэнні ведаў. Калектыў рэдакцыі пастаянна знаходзіцца ў пошуку новых формаў і метадаў удасканалення бібліяграфічнай папулярызацыі і чакае ад сваіх падпісчыкаў заўваг і прапаноў.

Наш адрас: 220636, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9. Навукова-бібліяграфічны аддзел, рэдакцыя бюлетэня «Новыя кнігі». Падпісны індэкс 74972.

**І.В.Нарчук**, *загадчык сектара навукова-бібліяграфічнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*